# Слова маюць бібліятэкары

## З 1-й агульнагарадской канферэнцыі бібліятэчных работнікаў

Бібліятэчная справа ўяўляецца таму-сяму ціхай і бесклапотнай, а супрацоўнікі бібліятэк—нейкімі архіварыусамі, якія толькі выдаюць кнігі і актыўна не ўдзельнічаюць у кіпенні нашых працоўных будняў.

Але вось адбылася 1-я агульнагарадская канферэнцыя бібліятэчных работнікаў Мінска, якая радасна здзівіла маладым запалам, творчай энергіяй, дзелавітасцю, здзівіла і колькасцю ўдзельнікаў.

Вялікую залу Палаца культуры прафсаюзаў запоўніла каля тысячы чалавек, якія працуюць у бібліятэках сталіцы, вучацца на бібліятэчным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута і ў бібліятэчным тэхнікуме.

Тысяча чалавек! Цэлая армія энтузіястаў бібліятэчнай справы. А побач з гэтай—яшчэ адна цікавейшая лічба: у нашай сталіцы дзейнічае звыш 450 бібліятэк—дзяржаўных, школьных, заводскіх, ведамасных, прафсаюзных, бібліятэк ВНУ. Кніжны фонд іх велізарны. Адна толькі Дзяржаўная бібліятэка імя У. І. Леніна налічвае каля 2,5 мільёна тамоў. 11 бібліятэк ВНУ—1 мільён 815 тысяч, фундаментальная бібліятэка АН БССР—684 тысячы. А колькі соцень і соцень тысяч тамоў ляжыць на паліцах астатніх бібліятэк, больш дакладна не ляжыць, а знаходзіцца ў пастаянным руху, чытаецца прагна і дапытліва рабочымі і інжынерамі, урачамі і студэнтамі, школьнікамі і настаўнікамі!

Кніжныя фонды бібліятэк — вялікае ідэйнае і культурнае багацце, сапраўды казачная скарбніца ведаў. Вось аб тым, як лепш выкарыстаць гэтае багацце, як паставіць яго цалкам на службу сямігодкі, на службу народу, і гаварылі ўдзельнікі канферэнцыі.

Аналіз работы бібліятэк сталіцы зрабіў у сваім дакладзе загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Мінскага гаркома КПБ тав. Міхневіч.

У цэнтры ўвагі дакладчыка, у цэнтры ўвагі ўсіх удзельнікаў канферэнцыі знаходзілася пастанова ЦК КПСС «Аб станові шчы і мерах паляпшэння бібліятэчнай справы ў краіне». Гарачым жаданнем выканаць гэтую пастанову, зрабіць усё для таго, каб кніга, як верны спадарожнік і друг савецкага чалавека, выйшла разам з ім на перадавыя рубяжы сямігодкі, былі прасякнуты ўсе выступленні.

Каштоўным вопытам сваёй работы падзяліліся загадчык масавай бібліятэкі Ленінскага раёна сталіцы тав. Дагаева, загадчык бібліятэкі імя Якуба Коласа тав. Усава, загадчык бібліяграфічнага аддзела бібліятэкі АН БССР тав. Васілеўская, дырэктар бібліятэкі імя Максіма Горкага тав. Ашаровіч і многія іншыя.

На канферэнцыі з цікавымі прамовамі выступілі загадчык кафедры бібліятэчнага факультэта Мінскага педінстытута тав. Талкачоў, сакратар гаркома камсамола тав. Кахновіч, пісьменнік Алесь Махнач.

Трэба адзначыць, што работа канферэнцыі была накіравана не толькі на прапаганду вопыту лепшых бібліятэк (бібліятэка аўтазавода, масавыя бібліятэкі Ленінскага і Сталінскага раёнаў, многія бібліятэкі вышэйшых навучальных устаноў). Побач з гэтым рэзка крытыкаваліся тыя бібліятэчныя работнікі, што працуюць без натхнення, без ініцыятывы. Так, напрыклад, бібліятэка мінскага Палаца піянераў, якая, здавалася б, павінна была быць узорнай, працуе недаравальна дрэнна. Варта прывесці хоць бы такія лічбы: кніжны фонд гэтай бібліятэкі складае 25 тысяч тамоў, а чытачоў—толькі 500 чалавек.

Бібліятэкі фабрыкі імя Крупскай і друкарні імя Сталіна сістэматычна не асвойваюць фондаў, якія адпускаюцца ім на набыццё літаратуры, у гэтых бібліятэках мала чытачоў.

На буйнейшым прадпрыемстве горада—трактарным заводзе—працуюць дзве бібліятэкі: бібліятэка фабкома і тэхнічная. Аднак абедзве яны працуюць дрэнна, не маюць паміж сабой сувязі, тэхнічная бібліятэка знаходзіцца ў непрыстасаваным памяшканні. Такое прадпрыемства, як трактарны завод, мае ўсе магчымасці мець у сябе адну вялікую, багатую бібліятэку і забяспечыць яе плённую работу.

Падрабязна і грунтоўна работа бібліятэк горада абмяркоўвалася ўчора на секцыях.

Удзельнікі прынялі сацыялістычныя абавязацельствы, накіраваныя на хутчэйшае выкананне пастановы ЦК КПСС, на рэзкае паляпшэнне работы бібліятэк.

**Т. ЯФІМАЎ.**

## УЧОРА Ў МІНСКУ

**НА ЗАВОДЗЕ ІМЯ КІРАВА** адбыўся семінар па групавому метаду апрацоўкі дэталей, прапанаванаму лаўрэатам Ленінскай прэміі тав. Мітрафанавым. Інжынер тав. Валкавыцкі падзяліўся вопытам укаранення гэтага метаду на заводзе.

◆

**З ВІЛЬНЮСА** ў Мінск прыбыла група членаў навукова-тэхнічнага таварыства Літоўскай чыгункі. Учора госці наведалі аўтамабільны завод, дзе азнаёміліся з працэсамі вытворчасці і выпускаемай прадукцыяй. Потым літоўскія чыгуначнікі зрабілі экскурсію па гораду.

◆

**СПАБОРНІЦТВЫ** па класічнай барацьбе Цэнтральнага савета студэнцкага спартыўнага таварыства «Буравеснік» пачаліся ў рэспубліканскім Доме фізкультуры. У іх прымаюць удзел звыш 500 барцоў, у тым ліку каля 40 беларускіх спартсменаў.

◆

**У ДЗЯРЖАЎНЫМ ЦЫРКУ** пачаў выступленні заслужаны артыст РСФСР Юрый Дураў са сваімі чатырохногімі сябрамі.